# Шматгранная **народная** творчасць

**Алена Хмялькова**

*Фота з архіва Метадычнага цэнтра народнай творчасці*

Мы часта чуем выраз «народная творчасць». Але што гэта такое? Гэта творчая дзейнасць народа, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэалы. Якія б выпрабаванні ні пасылаў лёс, душа чалавека створана так, што, пераадольваючы цяжкасці, яна заўсёды імкнецца да найлепшага, стваральнага. Таму ў народзе вякамі існавалі паэтычныя (міфы, легенды, казкі), музычныя творы, тэатры, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, побытавыя танцы і абавязкова песня.

1 Свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст. Мсціслаў».
2 Праект «Ручнік як шлях жыцця чалавека» (Рэспубліканскае свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). 2021.
3 «Народная прыпеўка» – свята ў Слаўгарадскім раёне.
4 Народны майстар Беларусі бондар Уладзімір Станкевіч (Глускі раён).
5 Рэгіянальнае свята-конкурс «Свята-лялькі» (Круглянскі раён).
6 Фестываль-конкурс мастацтваў «Залатая мара».
7 Свята народнага касцюма (Рэспубліканскае свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). 2018.
8 Абласны агляд-конкурс аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі».
9 Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны харэаграфічны ансамбль «Алеся» Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.
10 – 13 Падчас Рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»).
11 Адольф Быкоўскі вучыць танцам Паўлінку. Міжрэгіянальны фестываль-свята аматарскіх тэатральных калектываў «Тэатральныя вечарыны» (г.п. Краснаполле).
12 Вырабы майстроў Магілёўскай зямлі.
14 Бялыніцкі раён прадстаўляе...
15 Гліняныя цацкі-свістулькі Магілёўскага Падняпроўя.
16 Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фольк-шоу-балет «Альянс» гімназіі-каледжа мастацтваў Бабруйска.
17 Абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» (Бабруйскі раён).
18 Міжнародны фестываль народнай творчасці «Вянок дружбы» праходзіць на Бабруйскай зямлі.
19 Свята «Спас — усяму час» (Слаўгарадскі раён).
20 Традыцыі шапавальства шануюць на Дрыбіншчыне.
21 Падчас абласнога этапу Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны».
22 Падчас абраду «Зажынкі».
23 Дзіцячы калядны абрад «Куры» (Клічаўскі раён).
24 Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка».

Народная творчасць Магілёўскай вобласці таксама шматгранная і разнастайная. На нашай зямлі праводзяцца міжнародныя, рэспубліканскія, рэгіянальныя, раённыя фестывалі, якія аб'ядноўваюць у сабе ўсе вехі народнай творчасці, што накіраваныя на яе папулярызацыю, захаванне, адраджэнне. Кожны куточак Магілёўшчыны мае свае адметныя рысы. Так, на Бабруйскай зямлі гэта міжнародны фестываль народнай творчасці «Вянок дружбы», на Мсціслаўшчыне — свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст. Мсціслаў», у Касцюковіцкім раёне — раённае свята «Гусінае свята», у Слаўгарадскім — рэгіянальныя святы «Спас — усяму час» і «Народная прыпеўка». Гэты пералік можна працягваць доўга.
Найбольш распаўсюджаны від народнай творчасці — песня. Менавіта песня суправаджае нас ад нараджэння да трызны. Яна цесна звязана з бытам, каляндарным цыклам, працоўнай дзейнасцю чалавека. Песні традыцыйных вясельнага абраду і абраду хрышчэння в. Паршына Горацкага раёна, мясцовы стыль песеннай, танцавальнай і народна-апавядальнай лакальнай традыцыі міжрэчча Сожа і Проні (Чавускі раён), песні традыцыйнага вясельнага абраду в. Клін Хоцімскага раёна занесены ў Дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.
А колькі мерапрыемстваў разнастайных тэматык праводзіцца на Магілёўшчыне! Усе і не пералічыць, бо ў кожным рэгіёне ладзяцца раённыя фестывалі, агляды-конкурсы, якія ахопліваюць розныя жанры аматарскай мастацкай творчасці. Гэта і рэгіянальны конкурс ансамбляў фальклорнай і народнай песні «З века ў век» (Чэрыкаўскі раён), рэгіянальны фальклорны фестываль «З крыніц жыватворных» (Хоцімскі раён), рэгіянальны фестываль дзіцячай творчасці «Зоркі над Бесяддзю» (Хоцімскі раён).
У 2023/2024 годзе Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці рэалізоўвае абласны маштабны творчы праект «Беларусь родная, музычная, народная», у рамках якога праходзіць творчая прэзентацыя раёнаў, тэатральныя гасціныя народных аматарскіх калектываў.
Таксама праведзены абласны агляд-конкурс ветэранскіх аматарскіх калектываў мастацкай творчасці і індывідуальных выканаўцаў XII Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны».
Тэатральны жанр заўсёды застаецца запатрабаваным, і ў сістэме клубных устаноў дзейнічаюць калектывы высокага мастацкага ўзроўню: народны тэатр Краснапольскага Цэнтра культуры, народны тэатральны калектыў «Прамень» Хоцімскага раённага Цэнтра культуры, тэатры «Валянцін» і «Серпантын» Магілёўскага гарадскога цэнтра культуры і вольнага часу і іншыя. Некаторыя рэгіёны стварылі свае тэатральныя традыцыі: адкрыты гарадскі фестываль аматарскага тэатральнага мастацтва «Святло рампы», г. Магілёў, міжрэгіянальны фестываль-свята аматарскіх тэатральных калектываў «Тэатральныя вечарыны», г.п. Краснаполле. Для развіцця аматарскіх тэатральных калектываў Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці праводзіць абласны агляд-конкурс аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі».





9 10
11 12










13 14
15 16







17




18




19




20



21



22





24

У кожнага народа існуюць свае танцы, якія адлюстроўваюць характар, традыцыі і звычаі. Вядомыя беларускія народныя танцы — «Лявоніха», «Крыжачок», полька, кракавяк, падыспань, кадрыля і іншыя. У Магілёўскай вобласці прадстаўлены ўсе віды харэаграфічнага жанру — ад народна-сцэнічнага танца да новых кірункаў сучаснай харэаграфіі. Візітоўкай Магілёўшчыны на розных фестывальных пляцоўках з'яўляюцца Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца «Юность» Палаца мастацтваў г. Бабруйска, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фольк-шоу-балет «Альянс» гімназіі-каледжа мастацтваў Бабруйска, Заслужаны аматарскі калектыў народны харэаграфічны калектыў «Сувенір» Палаца культуры вобласці; Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны харэаграфічны ансамбль «Алеся» Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

Неад'емнай часткай народнай творчасці з'яўляецца дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Пашырана салома- і лозапляценні, шапавальства, дрэваапрацоўка, ткацтва, выцінанка, кераміка і ганчарства.

Далёка за межамі вобласці вядомы дрыбінскія валёнкі і лапці, створаныя рукамі майстроў народных студый «Шапавал», «Лапаточак», драўляныя скульптуры і бочкі — майстроў Краснапольскага, Глускага раёнаў. Саламяныя вырабы майстроў Магілёўскай зямлі зачароўваюць сваёй вытанчанасцю, летуценнасцю, ажурнасцю, мастацкімі вобразамі. Велізарныя карзіны з кветкамі, купальскія і жніўеньскія вянкі, незлічоная колькасць лялек розных памераў прыцягваюць позірк на выставах-кірмашах.

Лазяныя вырабы — гэта не проста кошыкі для бытавога выкарыстання, гэта і вазы, і цукерачніцы, і дэкаратыўныя вобразы птушак, жывёл. Мова вышыўкі не горш за словы можа расказаць гісторыю народа. Яна адкрывае цэлы свет вобразаў, падзей, вераванняў і лёсаў многіх пакаленняў. Менавіта таму ткачыхі Магілёўшчыны старанна выплятаюць на нітах абярэжныя сімвалы, бо для беларусаў ручнік не проста рэч хатняга выкарыстання, а сямейная рэліквія.

Развіваюцца і сучасныя кірункі дэкаратыўна-прыкладной творчасці: батык, тэкстыльная лялька, папяровая пластыка, квілінг і іншыя.

Для папулярызацыі народных мастацкіх рамёстваў, розных кірункаў і жанраў дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў рэгіёнах вобласці праходзяць: рэгіянальны фестываль народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» (Дрыбінскі раён), міжрэгіянальны фестываль-конкурс народнай творчасці «Крычаўскі канёк» (Крычаўскі раён); пленэр па саломапляценні (Чэрыкаўскі раён); рэгіянальны фестываль народных промыслаў і рамёстваў «Краснапольскі глечык» (Краснапольскі раён), штогадовы пленэр па ганчарстве і кераміцы, які праходзіць у рамках рэгіянальнага фестывалю народнай творчасці і рамёстваў «Глушанскі хутарок» (Бабруйскі раён); рэгіянальнае свята-конкурс «Свята лялькі» (Круглянскі раён) і іншыя.

На тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны захаваліся характэрныя для ўсіх славянскіх народаў традыцыйныя святы і абрады, таксама неабходныя сучаснаму грамадству, бо яны арыентаваныя на вялізарны жыццёвы вопыт нашых продкаў.

Акрамя агульнавядомых свят і абрадаў, такіх як «Каляды», «Купалле», «Дажынкі», жыхары вёсак Магілёўшчыны захавалі мясцовыя сакральныя абрады і іх адметныя элементы: Клічаўскі раён — дзіцячы калядны абрад «Куры», Клімавіцкі раён — абрад «Зазыванне дажджу», Мсціслаўскі раён — абрад «Варвараўская свяча», Краснапольскі раён — «Дзесятуха», Хоцімскі раён — «Жаніцьба Ясеня», «Капусткі», Бабруйскі раён — «Нашэнне Прошчы», «Ваджэнне і пахаванне стралы». Каля в. Клін Слаўгарадскага раёна на мядовы Спас традыцыйна праводзіцца паломніцтва і пакланенне святой «Блакітнай крыніцы», традыцыі якой больш за 1000 гадоў.

Ужо 85 гадоў Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы захоўвае асноватворную місію зберажэння і развіцця традыцыйнай культуры і далучэння да яе каштоўнасцей падрастаючага пакалення, ажыццяўляе падтрымку і развіццё аматарскай мастацкай творчасці, з'яўляецца матыватарам і сродкам фарміравання і ўзбагачэння фестывальнага руху Магілёўшчыны. Пры непасрэдным яго ўдзеле ў справе падтрымкі аматарскай творчасці і захавання розных відавых і жанравых кірункаў традыцыйнай культуры штогод рэалізуецца каля 30 міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных культурных падзей, сярод якіх міжнародныя фестывалі дзіцячай творчасці «Залатая пчолка», тэатральнага мастацтва «Тэатральная вясна», фестываль-конкурс мастацтваў «Залатая мара», харэаграфічны конкурс «Танцавальная карусель» і іншыя.

На працягу 14 гадоў аўтарам канцэпцый і адказным выканаўцам шэрагу мерапрыемстваў рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») з'яўляецца Магілёўскі абласны цэнтр культуры і народнай творчасці. Свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») стала не проста візітнай карткай у летнім календары рэгіёна, а сапраўдным культурным дасягненнем Беларусі. За рэалізаваны ў 2023 годзе адзін з маштабных праектаў свята — выстава-кірмаш «Абярэг міру і саюзнага адзінства» — калектыў Цэнтра стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

І крыху статыстычных дадзеных.

У Магілёўскай вобласці налічваецца 312 клубных устаноў, пры якіх дзейнічае больш за 2500 клубных фарміраванняў. Больш за 400 калектываў мастацкай творчасці носяць найменні «народны», «узорны», у тым ліку 19 калектываў маюць званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь»; 25 майстроў — статус «народны майстар».

Развіццё і падтрымка народнай творчасці Магілёўшчыны рэалізуецца па асноўных прынцыпах, якія замацаваны ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры, — прыярытэт развіцця беларускай нацыянальнай культуры і прызнанне беларускай мовы адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту; адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальных культурных традыцый; зберажэнне і прымнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны, узаемадзеянне беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў і яе інтэграцыя ў сусветную культуру, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя.